УДК 930.1 (476) «1921/1939» DOI 10.63874/2218-0281-2026-1-13-24

***Аляксандр Мікалаевіч Вабішчэвіч***
*д-р гіст. навук, праф., праф. каф. усеагульнай гісторыі і паліталогіі*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Aliaksandr Vabishchevich***
*Doctor of Historical Sciences, Professor,*
*Professor of the Department of General History and Political Science*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: vabischev@rambler.ru

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.) ЯК АБ’ЕКТ ВЫВУЧЭННЯ Ў СУЧАСНЫХ АЙЧЫННЫХ ГІСТАРЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ

*Сістэматызаваны гістарыяграфічныя веды аб культурным жыцці Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы ў 1921–1939 гг., якія выкладзены ў абагульняючых калектыўных даследаваннях, манаграфіях і дысертацыях беларускіх вучоных за 1991–2025 гг. Выяўлены адметнасці гістарычных даследаванняў (праблемна-тэматычная навізна і актуальнасць, разнастайнасць крыніц, спалучэнне традыцыйных і інавацыйных навуковых метадаў, полідысцыплінарнасць). Адзначана перавага беларусацэнтрычнай канцэптуальнай мадэлі культуры Заходняй Беларусі, якая не выключае яе поліэтнічнасць і поліканфесіянальнасць. Вызначаны перспектыўныя тэмы для далейшых даследаванняў праблематыкі.*

***Ключавыя словы:*** *Заходняя Беларусь, Польшча, культурнае жыццё, паланізацыя, беларусацэнтрычная канцэпцыя, поліэтнічнасць, поліканфесіянальнасць, гістарыяграфія, Рэспубліка Беларусь.*

## *Cultural Life in Western Belarus (1921–1939) as an Object of Study in Modern Domestic Historical Research*

*The article systematizes historiographic knowledge about the cultural life (cultural development, culture) of Western Belarus as part of Poland in 1921–1939, which is set out in generalizing collective studies, individual monographs and dissertations of Belarusian scientists for 1991–2025. The features of historical research are identified (problem-thematic novelty and relevance, diversity of sources; combination of traditional and innovative scientific methods, multidisciplinary nature). The advantage of the Belarusocentric conceptual model of the culture of Western Belarus, which did not exclude its multi-ethnicity and multi-confessionality, is noted. Promising topics for further research on the issue are identified.*

***Key words:*** *Western Belarus, Poland, cultural life, polonization, Belarusocentric concept, polyethnicity, polyconfessionality, historiography, Republic of Belarus.*

## Уводзіны

Гісторыя Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы (1921–1939 гг.) з’яўляецца традыцыйным напрамкам у айчыннай гістарычнай навуцы ўжо на працягу стагоддзя. На сучасным этапе развіцця беларускага грамадства (з 1991 г.) гэтая праблематыка значна пашырылася на падставе новых масіваў крыніц, якія сталі даступнымі для даследчыкаў (асабліва архіўных дакументаў), і новых навукова-метадалагічных падыходаў. Разам з вывучэннем розных праблемна-тэматычных аспектаў сацыяльна-эканамічнага стану, грамадска-палітычнага жыцця было разгорнута даследаванне культурнага жыцця (культурнага развіцця, культуры) заходнебеларускіх зямель, што недаацэньвалася ці скажалася ў савецкі перыяд. У выніку ігнаравання заходнебеларускай культурнай спадчыны, створанай прадстаўнікамі «чужых» сацыяльных, нацыянальных дзеячаў і арганізацый, «адбылося збядненне сацыякультурнай гісторыі Заходняй Беларусі, адмаўленне ад значных дасягненняў беларускага народа ў матэрыяльнай і духоўнай культуры, у галіне адукацыі, навукі, літаратуры і мастацтва» [1, с. 49].

Айчынная гістарыяграфія гісторыі культуры Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) пакуль не з’яўлялася прадметам асобнага даследавання. Пэўныя спробы гістарыяграфічнага аналізу былі зроблены ў калектыўных выданнях [2, с. 10–11; 3, с. 55–64], у некаторых манаграфіях [4, с. 8]. Сярод першых гістарыяграфічных аналітычных аглядаў

стану даследавання гісторыі культуры Заходняй Беларусі (навуковай распрацоўкі праблем адукацыі, асветы і мастацтва, а таксама айчыннай гістарыяграфіі канфесійнай гісторыі) трэба адзначыць працы А. А. Савіча [4, с. 169–206; 5, с. 155–181].

Для правядзення перспектыўных навуковых праектаў, тэмаў па заходнебеларускай праблематыцы варта падвесці вынікі ўжо ажыццёўленых навуковых даследаванняў. Мэтай артыкула з'яўляецца сістэматызацыя гістарыяграфічных ведаў аб культурным жыцці (культурным развіцці, культуры) Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., выкладзеных у гістарычных даследаваннях у Рэспубліцы Беларусь. Для аналізу былі выкарыстаны абагульняючыя калектыўныя даследаванні (манаграфіі), індывідуальныя манаграфіі, доктарскія і кандыдацкія дысертацыі беларускіх вучоных за 1991–2025 гг.

**Асноўная частка**

У незалежнай Рэспубліцы Беларусь пачалося канцэптуальнае пераасэнсаванне айчыннай гісторыі і заходнебеларускага перыяду 1920–1930-х гг. у прыватнасці. Найперш гэта можна прасачыць на прыкладзе калектыўных выданняў. У другой частцы «Нарысаў гісторыі Беларусі» (Мінск, 1994–1995) У. А. Палуянам прыведзены звесткі пра нацыянальны прыгнёт, дзейнасць ТБШ і іншых заходнебеларускіх арганізацый, палітычных партый [7, с. 214–253].

Некаторыя аспекты грамадска-культурнага развіцця Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. раскрыты намі ў навуковым выданні «Гісторыя Беларусі» пад рэдакцыяй акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі М. П. Касцюка [2, с. 352–448].

Агляд стану заходнебеларускай культуры зроблены намі ў энцыклапедыі «Культура Беларусі» [8, с. 87–91].

У калектыўнай манаграфіі «Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг.» намі разам з Э. С. Ярмусікам, А. Г. Цымбалам, К. С. Разуванавай разгледжаны стан адукацыі, навукі, культуры і рэлігійнага жыцця ў заходнебеларускім рэгіёне. У прыватнасці, прадметам нашага вывучэння былі наступныя пытанні: палітыка Польскай дзяржавы ў галіне адукацыі і культуры, дзейнасць ТБШ, навука, мастацкая культура, польскія ўстановы і грамадскія арганізацыі, культура рускай, украінскай, яўрэйскай, літоўскай і татарскай меншасцей [2, с. 477–498, 506–522, 550–554].

У калектыўным акадэмічным выданні «Этнокультурные процессы Западного Полесья (Брестчины) в прошлом и настоящем» намі ажыццёўлены аналіз грамадска-культурнай дзейнасці этнаканфесіянальных супольнасцей Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. [9, с. 276–357].

Разнастайныя аспекты культурнага развіцця Заходняй Беларусі ў міжваенны час выкладзены таксама ў індывідуальных манаграфіях, доктарскіх і кандыдацкіх дысертацыях. Праблематыка беларускай асветы ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. асветлена намі ў кандыдацкай дысертацыі і асобнай манаграфіі [10]. Там прааналізавана палітыка польскіх улад у галіне адукацыі, стан і праблемы захавання беларускіх гімназій і пачатковых школ, пытанні асветніцтва ў дзейнасці заходнебеларускіх партый і арганізацый.

У чарговай манаграфіі [4] і доктарскай дысертацыі [11] аб'ектам нашага даследавання з'яўлялася нацыянальна-культурнае жыццё ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Пад паняццем «нацыянальна-культурнае жыццё» разумелася дзейнасць грамадства і яго інстытутаў у галіне нацыянальнай культуры, працэсы ў культурным жыцці этнічных (нацыянальных) супольнасцей (этнасаў). У якасці асноўнай была ўзята трактоўка паняцця культуры на падставе дзейнаснага падыходу, які разглядае культуру ў якасці спецыфічнага спосабу чалавечай жыцця-дзейнасці, механізму адаптацыі і асновы творчай актыўнасці чалавека. У выніку праведзенага даследавання намі была распрацавана навуковая канцэпцыя нацыянальна-культурнага жыцця ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. як цэласнай сістэмы існавання раз'яднанай часткі беларускай нацыі ў межах поліэтнічнай Польскай дзяржавы. Была прааналізавана культура беларусаў як большасці карэннага насельніцтва, а таксама палякаў, якія, хоць і былі тытульным этнасам у Польшчы, але не складалі большасці сярод насельніцтва на тэрыторыі Заходняй Беларусі, і іншых нацыянальных і канфесіянальных супольнасцей (яўрэяў, рускіх, украінцаў, літоўцаў, татараў, стараабраднікаў) [11, с. 17–18].

У манаграфіях В. І. Крывуця [12–14], яго кандыдацкай [15] і доктарскай дысертацыях [16] раскрыты працэс фарміравання і сутнасць канцэпцыі «дзяржаўнага выхавання», якая стала асновай дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі Польшчы і сродкам паланізацыі моладзі Заходняй Беларусі. Ён вызначыў асноўныя напрамкі маладзёжнай палітыкі (сярод іх – сістэму дзяржаўнай школьнай адукацыі) і асаблівасці іх рэалізацыі на заходнебеларускіх землях [16, с. 7–8].

Этнаканфесіянальная палітыка польскіх улад у адносінах да беларускага насельніцтва была прадметам вывучэння кандыдацкай дысертацыі А. М. Загідуліна [17], выкладзена ў яго манаграфіі [18]. Ён сцвярджае, што нацыянальная і канфесіянальная палітыка не дала патрэбных вынікаў для польскай адміністрацыі, і яе варожа ўспрымала няпольскае насельніцтва [17, с. 16].

У кандыдацкай дысертацыі [19] і манаграфіі В. В. Даніловіча [20] супрацоўніцтва арганізацыі «Змаганне» з ТБШ атрымала абгрунтаваныя і ўзважлівыя ацэнкі. Сутнасць працэсаў нацыянальна-культурнага адраджэння ў заходнебеларускім рэгіёне вывучаў В. М. Гліна [21].

Грамадска-культурная дзейнасць у кантэксце парламенцкага змагання за нацыянальныя і сацыяльныя правы беларускага народа ў Польшчы ў 1921–1930 гг. адлюстравана ў кандыдацкай дысертацыі А. В. Пашкевіча [22].

Прадметам вывучэння ў кандыдацкай дысертацыі А. І. Пашковіч [23] былі беларускія дабрачынныя арганізацыі, якія падтрымлівалі нацыянальныя навучальныя і апякунскія ўстановы, праводзілі культурна-асветніцкую працу, што садзейнічала фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Сярод галоўных напрамкаў дзейнасці беларускіх дабрачынных таварыстваў вылучана і культурна-асветніцкая праца, што суправаджалася распаўсюджваннем беларускай нацыянальнай ідэі [23, с. 4, 16].

Ліквідацыя непісьменнасці, забеспячэнне насельніцтва пачатковай адукацыяй і іншыя сацыяльныя пытанні былі надзёнымі ў дзейнасці мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання і самакіравання, якія вывучаў А. І. Борка [24; 25]. У кандыдацкай дысертацыі А. Л. Дарковіча [26] закраналася грамадска-культурная дзейнасць яўрэяў і іншых супольнасцей у органах гарадскога самакіравання Заходняй Беларусі.

К. С. Разуванава ў кандыдацкай дысертацыі [27] і манаграфіі паказала, што Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры ўнёс значны ўклад у культурнае жыццё краю. Гэтая культурна-асветніцкая арганізацыя плённа папулярызавала гаспадарчыя веды і кааперацыю, спрыяла развіццю нацыянальнай адукацыі, асветы, навукі, выдавецкай справы, тэатральнага і музычнага мастацтва ў Заходняй Беларусі [27, с. 6].

А. С. Горны ў кандыдацкай дысертацыі раскрыў дзейнасць паланафільскай плыні, яе праграмныя мэты, арганізацыйную структуру, асноўныя напрамкі дзейнасці, характар узаемаадносін з польскімі ўладамі, палітычнымі партыямі і грамадскімі арганізацыямі Заходняй Беларусі і Польшчы [28, с. 3–5]. Нягледзячы на слабы грамадска-палітычны ўплыў, паланафілы выкарыстоўвалі культурна-асветніцкую і выдавецкую дзейнасць для пашырэння ўплыву сярод насельніцтва [28, с. 16]. В. Э. Рабышка прасачыла этнапалітычныя працэсы ў Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гг. [29].

У кандыдацкай дысертацыі А. Г. Трубчык выяўлена мэтавая накіраванасць палітыкі польскіх улад у галіне адукацыі на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1919–1921 гг., раскрыта спецыфіка фарміравання сістэмы польскіх органаў кіравання школьнай справай і механізм кіравання сферай адукацыі, вызначаны асноўныя напрамкі адукацыйнай палітыкі польскіх улад, яе рэгіянальная спецыфіка і інш. [30, с. 3–4]. Суіскальнік адлюстравала кан'юнктурны характар уступак польскай адміністрацыі ў галіне беларускай асветы, якая была пастаўлена ў адміністрацыйную і фінансавую залежнасць ад польскай улады. У кастрычніку 1920 г. арганізацыя беларускіх школ спынілася на тэрыторыі, якая адыходзіла да Польшчы, і часова перамясцілася ў Сярэднюю Літву [30, с. 5].

Г. С. Вайцешчык у кандыдацкай дысертацыі [31] прааналізавала асноўныя кампаненты сацыякультурнай дзейнасці ў мястэчках: адукацыю, тэатр, кіно, культурна-асветніцкія, забаўляльныя ўстановы і арганізацыі, побыт і інш. У кандыдацкай дысертацыі А. Л. Радзюка [32] адлюстравана дзейнасць не толькі спажывецкіх, вытворчых, але і культурна-асветніцкіх кааператываў у 1926–1929 гг. Пытанні грамадска-

культурнай адаптацыі перасяленцаў з Заходняй Беларусі ў краінах Еўропы, Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі, Палесціне разглядала ў кандыдацкай дысертацыі В. М. Мярчук [33]. Л. В. Лаўрэенка ў кандыдацкай дысертацыі [34] паспрабавала стварыць цэласную карціну паўсядзённага побыту жыхароў гарадоў, мястэчак і вёсак Заходняй Беларусі. У. А. Ганскі вывучаў турыстычную дзейнасць на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. [35].

К. Дз. Ананька ў кандыдацкай дысертацыі, прысвечанай беларускім гімназіям у Заходняй Беларусі [36], ахарактарызаваў нацыянальныя, канфесіянальныя, сацыяльныя, гендэрныя паказчыкі іх педагагічнага персаналу і вучнёўскага кантынгенту, у выніку чаго выявіў сукупнасць адметнасцей настаўніцкіх кадраў і навучэнцаў. Таксама ён раскрыў спецыфіку арганізацыі адукацыйнага працэсу ў беларускіх гімназіях, удзел беларускіх гімназій у грамадска-палітычным жыцці і сацыякультурнай дзейнасці заходнебеларускіх зямель, што дазволіла паказаць ролю педагогаў і навучэнцаў у захаванні этнакультурнай ідэнтычнасці насельніцтва краю.

Пытанні культурнага жыцця распрацоўваліся таксама ў даследаваннях па гісторыі рэлігіі. Дзяржаўна-канфесіянальныя адносіны, дзейнасць асобных хрысціянскіх царкоўных структур раскрыты Э. С. Ярмусікам, А. М. Свірыдам, І. І. Трацяком, Э. А. Мазько, А. Г. Цымбалам, Т. В. Лісоўскай і інш. даследчыкамі.

У кандыдацкай дысертацыі А. Г. Цымбала [37] і яго манаграфіі [38] раскрыты дзяржаўна-канфесіянальныя адносіны, становішча праваслаўнага духавенства, дзейнасць царкоўных структур на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

А. М. Свірыд у кандыдацкай дысертацыі [39] і манаграфіі [40] паказаў сацыякультурную дзейнасць уніяцкіх святароў у асобных мясцовасцях, адлюстраваў працу ўніяцкага духавенства ў справе адраджэння беларускай культуры, мовы.

Т. В. Лісоўская ў кандыдацкай дысертацыі вызначыла, што супрацоўніцтва метадыстаў з беларускім нацыянальным рухам было апалітычным, накіраваным на распаўсюджванне веравучэння сярод моладзі, праявілася ў аказанні фінансавай дапамогі, наладжванні дабрачынных і культурна-асветніцкіх акцый [41, с. 23]. У яе манаграфіі, прысвечанай гісторыі позняга пратэстантызму ў Заходняй Беларусі [42], раскрыта дзяржаўная палітыка Польшчы адносна гэтага хрысціянскага напрамку ў заходнебеларускім краі, паказаны працэс яго станаўлення і развіцця (унутрыабшчынная дзейнасць, дзейнасць па-за абшчынай), міжканфесіянальныя адносіны. Як адзначана Т. В. Лісоўскай у манаграфіі аб з’яўленні, развіцці і дзейнасці позніх пратэстанцкіх рухаў з канца XIX ст. да 1991 г., гарызантальная структура позняга пратэстантызму была рэалізавана праз служэнні і падабшчынныя арганізацыі (пастырскае, місіянерскае, музычнае, маладзёжныя, жаночыя гурткі, нядзельныя школы і інш.) [43, с. 369].

Рэлігійная праблематыка заходнебеларускіх зямель актыўна разглядаецца ў айчыннай культуралогіі. Найперш трэба адзначыць манаграфічную працу У. М. Конана «Ксёндз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэнне ў Беларусі» (Мінск, 2003).

Э. А. Мазько ў кандыдацкай дысертацыі [44] паспрабаваў вызначыць уплыў Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі на фарміраванне агульнай культурнай сітуацыі ў Заходняй Беларусі. У кандыдацкай дысертацыі [45], манаграфіях «Беларускае каталіцкае духавенства ля вытокаў сацыякультурнай ідэнтыфікацыі» (Гродна, 2013), «Беларускае каталіцкае духавенства ў сацыякультурным працэсе першай паловы XX стагоддзя» (Гродна, 2019) І. І. Трацяка закранута праблематыка этнакультурнай ідэнтыфікацыі беларускага каталіцкага духавенства, фарміраванне яго светапогляду, разгледжана душпастырская і грамадска-культурная дзейнасць беларускіх каталіцкіх святароў ва ўмовах ганенняў і ўціску з боку польскіх улад у 1921–1939 гг.

У кандыдацкай дысертацыі [46] і манаграфіі Н. В. Самасюк [47] раскрыты напрамкі развіцця культурнай тоеснасці жыхароў заходнебеларускіх зямель праз прызму дзейнасці Праваслаўнай царквы. Адзначаецца, што неабходнасць развіцця беларускай культурнай ідэнтычнасці праваслаўнага насельніцтва Заходняй Беларусі раней царкоўных улад усвядомілі прадстаўнікі беларускага праваслаўнага руху. Праваслаўнае духавенства, арыентаванае на беларускія культурныя традыцыі і каштоўнасці, аказала

найбольшы ўплыў на складванне нацыянальнай ідэнтычнасці. Пры гэтым значная частка праваслаўнага духавенства забяспечвала захаванне рускай культурнай ідэнтычнасці, традыцыі рэлігійнай маральнай асветы [46, с. 4–5].

Разам з вывучэннем нацыянальна-культурнага жыцця беларусаў у сучаснай айчыннай гістарычнай навуцы разгорнута вывучэнне культуры асобных нацыянальных і канфесіянальных супольнасцей. Хоць А. К. Гецэвіч акцэнтаваў сваю ўвагу на вывучэнні грамадска-палітычнай дзейнасці польскіх партый і арганізацый у заходнебеларускім рэгіёне, аднак ён закранаў і пытанні культуры. Даследчык падкрэсліваў, што палітыка адноўленай Польскай дзяржавы фарміравалася пад уплывам культурна-гістарычнага, эканамічнага і знешнепалітычнага фактараў [48, с. 16].

Працы В. М. Чарапіцы і В. Р. Швайко прысвечаны гісторыі рускіх арганізацый, іх узаемаадносінам з Праваслаўнай царквой. У манаграфіі В. М. Чарапіцы [49] прыведзены дакументальныя крыніцы аб становішчы праваслаўных прыходаў на Гродзеншчыне, дзейнасці там мясцовага духавенства, аб грамадскім руху «праваслаўных палякаў» і інш. В. Р. Швайко ў кандыдацкай дысертацыі [50] вылучыла сярод рускага насельніцтва асобна эмігрантаў і прадстаўнікоў рускай нацыянальнай меншасці, улічваючы іх рознае прававое становішча, ідэйна-палітычныя разыходжанні і інш.

І. Б. Канапацкі і Л. М. Лыч разглядалі грамадска-культурнае жыццё татараў заходнебеларускіх зямель у 1920-я – 1930-я гг. у агульным кантэксце этнакультурных працэсаў у Беларусі. Э. Р. Іофэ асвятляў дзейнасць асобных прадстаўнікоў яўрэйскай інтэлігенцыі заходнебеларускіх гарадоў і мястэчак [51], паказаў ролю Вільні ў культурным жыцці краю. Дзейнасць яўрэйскіх партый і арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі вывучалі А. В. Машчук [52], П. Т. Стэцкевіч [53], В. Л. Шчука [54] і інш. вучоныя. У прыватнасці, П. Т. Стэцкевіч даследаваў культурна-асветніцкую і дабрачынную дзейнасць яўрэйскіх палітычных партый і арганізацый у Заходняй Беларусі ў 1918–1926 гг.

В. Л. Шчука сярод асноўных напрамкаў дзейнасці яўрэйскіх партый і арганізацый сіяніцкага і культурна-аўтанамісцкага тыпаў у Заходняй Беларусі вылучала іх працу па ўмацаванні пазіцый сярод яўрэйскага насельніцтва, захаванні яго нацыянальнай культуры і традыцый, для чаго і ствараліся маладзёжныя, культурна-асветніцкія, рэлігійныя, дабрачынныя арганізацыі [54, с. 5–6]. В. А. Сабалеўская разам з У. У. Ганчаровым выдала манаграфію, прысвечаную гісторыі яўрэяў-літвакоў Гродзеншчыны ў 1795–1939 гг. [55].

Змястоўнымі і наватарскімі з’яўляюцца даследаванні па гісторыі традыцыйнай культуры, музейнай справы, аховы помнікаў, краязнаўства. У манаграфіі В. А. Лабачэўскай «Зберагаючы самабытнасць: з гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі» народнае мастацтва і промыслы Заходняй Беларусі разгледжаны як частка агульнанацыянальнай мастацкай культуры.

У доктарскай дысертацыі А. А. Гужалоўскага [56] раскрыта дзейнасць Віленскага беларускага музея, паказаны працэс стварэння краязнаўчых музеяў у Заходняй Беларусі. І. У. Цітовіч у кандыдацкай дысертацыі [57] прасачыў станаўленне і развіццё краязнаўчага руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі, раскрыў яго змест і ідэалагічную накіраванасць. У кандыдацкай дысертацыі Дз. В. Марозава [58] раскрыты ход стварэння, структура і характар дзейнасці органаў польскай улады, адказных за ахову помнікаў архітэктуры ў Заходняй Беларусі, вызначана іх матэрыяльнае забеспячэнне і фінансаванне, дадзена характарыстыка кадравага складу акруговых упраў кансерватараў, высветлена роля польскіх чыноўнікаў, беларускіх дзеячаў у справе вывучэння і аховы помнікаў гісторыі і культуры на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Паспяховымі з’яўляюцца распрацоўкі ў галіне айчыннай этналогіі. М. А. Міхайлец у кандыдацкай дысертацыі [59] даў ацэнку ўкладу польскіх этнографаў 1920–1940-х гг. у вывучэнне народнай матэрыяльнай культуры беларусаў. Навуковец прылічвае гэта да першых спроб акрэслення адзінага комплексу матэрыяльнай культуры беларускага этнасу, вывучэння яго асобных кампанентаў, даследавання народнай матэрыяльнай культуры беларусаў у агульнаславянскім кантэксце [59, с. 5].

І. У. Алюніна раскрыла вынікі вывучэння традыцыйнай сацыяльнай культуры Беларускага Палесся польскімі этнолагамі

1920–1930-х гг. Сярод важных іх дасягненняў выдзеліла распрацоўку метадаў этналагічнага даследавання, упарадкаванне тэрміналогіі [60, с. 6, 15].

Безумоўна, што ў дадзеным гістарыяграфічным аглядзе адзначаны толькі самыя значныя навуковыя дасягненні па вызначанай праблематыцы. Для паўнаты ахопу аналізу сучасных гістарычных даследаванняў трэба таксама дадаць публікацыі аўтара дадзенага артыкула і іншых даследчыкаў, якія змешчаны ў цэлым шэрагу энцыклапедычных выданняў: «Беларуская энцыклапедыя», «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі», «Культура Беларусі», «Рэлігія і царква на Беларусі», «Вялікае княства Літоўскае», «Францыск Скарына», «Янка Купала», «Хто ёсць хто сярод беларусаў свету» і інш. Аднак яны, як і артыкулы ў часопісах, зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый, з-за шматлікасці і спецыфікі, могуць быць прадметам асобнага гістарыяграфічнага вывучэння.

**Заключэнне**

У ходзе праведзенага агляду манаграфічных прац (абагульняючых, індывідуальных), дысертацыйных даследаванняў сучасных айчынных вучоных пра культурнае жыццё (культурнае развіццё, культуру) Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. вызначаны іх праблемна-тэматычная навізна і актуальнасць, разнастайная база крыніц (архіўных матэрыялаў з фондаў архіваў, бібліятэк і музеяў Беларусі і замежных краін, крыніц асабістага паходжання, перыядычнага друку і інш.), выкарыстанне традыцыйных і інавацыйных навуковых метадаў, полідысцыплінарнасць.

У сучасных гістарычных даследаваннях у Рэспубліцы Беларусь трывала замацавалася беларусацэнтрычная канцэптуальная мадэль культурнага жыцця (культурнага развіцця, культуры) Заходняй Беларусі ў вызначаны перыяд. Таму невыпадкова, што навуковыя працы пераважна прысвечаны якраз гісторыі культуры беларусаў, што складалі большасць насельніцтва, і іх сацыякультурнай дзейнасці. Аднак гэта не выключыла ўліку поліэтнічнасці і поліканфесіянальнасці, у выніку чаго прадметам вывучэння з'яўляюцца адукацыя, культура, навука, мастацтва іншых нацыянальных і канфесіянальных супольнасцей. Усё гэта дазваляе стварыць больш аб'ектыўную цэласную навуковую карціну культурнага жыцця гэтага краю.

Нягледзячы на значную распрацаванасць заходнебеларускай праблематыкі, цэлы шэраг тэматычных напрамкаў і сюжэтаў патрабуе далейшага даследавання.

Сярод іх трэба адзначыць паланізацыю заходнебеларускіх зямель як фактар грамадскага-палітычнага і культурнага жыцця, рэалізацыю палітыкі польскіх улад на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. на ваяводскім, павятовым, гарадскім, гмінным узроўнях, працэс інтэграцыі заходнебеларускіх зямель у склад БССР у 1939–1941 гг. і ў пасляваенны час. Варта пашыраць вывучэнне гісторыі і культуры асобных малых рэгіёнаў заходнебеларускага краю, паўсядзённага жыцця людзей.

Для ўмацавання гістарычнай памяці неабходна надаваць большую ўвагу гісторыка-біяграфічным даследаванням (рыхтаваць працы як пра вядомых дзеячаў і актывістаў Заходняй Беларусі, так і пра звычайных жыхароў і іх сем'і). Такія распрацоўкі маюць сацыяльную значнасць.

Актуальнай з'яўляецца мемарыялізацыя памяці пра кіраўнікоў, актывістаў заходнебеларускіх партый і арганізацый, прадстаўнікоў інтэлігенцыі ў помніках, назвах вуліц, устаноў адукацыі і культуры, для папулярызацыі айчыннай гісторыка-культурнай спадчыны ў публічнай прасторы.

## СПІС ВЫКАРЫСТЫНЫХ КРЫНІЦ

1. Савіч, А. А. Гісторыя Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) у айчыннай гістарыяграфіі 50–80-х гг. XX ст. / А. А. Савіч // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2020. – Т. 65, № 1. – С. 44–51.

2. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Мн. : Экаперспектыва, 2006. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.] ; рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – 616 с.

3. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. : в 2 кн. / НАН Беларуси, Ин-т истории; редкол. : А. А. Коваленя [и др.]. – Мн. : Беларус. навука, 2014. – Кн. 1. – 593 с.

4. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2008. – 319 с.

5. Савіч, А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): гістарыяграфія праблемы / А. А. Савіч. – Брэст : БрДУ, 2012. – 288 с.

6. Савіч, А. А. Айчынная гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў / А. А. Савіч. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2019. – 300 с.

7. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / Акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; рэдкал.: М. П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн. : Беларусь, 1994–1995. – Ч. 2. – 560 с.

8. Вабішчэвіч, А. М. Заходняя Беларусь / А. М. Вабішчэвіч // Культура Беларусі : энцыкл. : у 6 т. – Мн. : Беларус. Энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2010–2015. – Т. 4. –2013. – С. 87–91.

9. Этнокультурные процессы Западного Полесья (Брестчины) в прошлом и настоящем / А. В. Гурко [и др.] ; науч ред. А. В. Гурко ; Нац. акад. наву Беларуси, Центр исслед. белорус. культуры, языка и лит., Ин-т этнографии и фольклора им. Кондрата Крапивы. – Мн. : Беларус. навука, 2020. – 621 с.

10. Вабішчэвіч, А. М. Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2004. – 116 с.

11. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … д-ра гіст. навук : 07.00.02 / Вабішчэвіч Аляксандр Мікалаевіч ; БДУ. – Мн., 2010. – 52 с.

12. Кривуть, В. И. Молодежные организации на территории Западной Беларуси (1929–1939 гг.) / В. И. Кривуть. – Мн. : Беларус. навука, 2008. – 164 с.

13. Крывуць, В. І. Пад шыльдай «дзяржаўнага выхавання»: рэалізацыя ўрадавых выхаваўчых канцэпцый на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1926–1939) / В. І. Крывуць. – Баранавічы : РВА БарДУ, 2010. – 196 с.

14. Крывуць, В. І. Барацьба за маладое пакаленне Заходняй Беларусі і праўрадавы маладзежны рух (1926–1939 гг.) / В. І. Крывуць. – Баранавічы : БарДУ, 2013. – 273 с.

15. Кривуть, В. И. Молодежные организации на территории Западной Беларуси (1929–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Кривуть Виталий Иванович ; БГУ. – Мн., 2005. – 21 с.

16. Кривуть, В. И. Молодежная политика польских властей в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 07.00.02 / Кривуть Виталий Иванович ; Ин-т истории НАН Беларуси. – Мн., 2020. – 47 с.

17. Загідулін, А. М. Нацыянальная і канфесіянальная палітыка польскіх улад у адносінах да беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Загідулін Аляксей Мікалаевіч ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мн., 2005. – 20 с.

18. Загідулін, А. М. Беларускае пытанне ў польскай нацыянальнай і канфесійнай палітыцы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Загідулін. – Гродна : ГрДУ, 2010. – 183 с.

19. Даніловіч, В. В. Дзейнасць арганізацыі «Змаганне» ў Заходняй Беларусі (1927–1930 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Даніловіч Вячаслаў Віктаравіч ; БДПУ імя Максіма Танка. – Мн., 2000. – 21 с.

20. Даніловіч, В. В. Дзейнасць арганізацыі «Змаганне» ў Заходняй Беларусі (1927–1930 гг.) / В. В. Даніловіч. – Мн. : Беларус. навука, 2007. – 159 с.

21. Гліна, В. М. Сутнасць і асаблівасці нацыянальнага адраджэння ў Заходняй Беларусі (1920–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. філас. навук : 09.00.03 / Гліна Валянцін Мікалаевіч ; БДУ. – Мн., 1996. – 19 с.

22. Пашкевіч, А. В. Парламенцкія формы змагання за нацыянальныя і сацыяльныя правы беларускага народа ў міжваеннай Польшчы (1921–1930 гг.) : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 / Пашкевіч Аляксандр Васільевіч ; БДПУ імя Максіма Танка. – Мн., 2006. – 21 с.

23. Пашковіч, А. І. Дзейнасць дабрачынных арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. : аўтарэф. … дыс. канд. гіст. навук : 07.00.02 / Пашковіч Алена Іосіфаўна ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мн., 2007. – 22 с.

24. Борка, А. І. Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання і самакіравання ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Борка Андрэй Іванавіч ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Гродна, 2007. – 19 с.

25. Борка, А. І. Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання і самакіравання ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. І. Борка. – Гродна: ГрДУ, 2011. – 139 с.

26. Даркович, А. Л. Городское самоуправление на западнобелорусских землях межвоенной Польши (1919–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.03 / Даркович Александр Леонидович ; Ин-т славяноведения РАН. – М., 2016. – 30 с.

27. Разуванава, К. С. Дзейнасць Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры ў Заходняй Беларусі (1926–1936 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Разуванава Ксенія Сяргееўна ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мн., 2011. – 24 с.

28. Горны, А. С. Беларускія паланафільскія арганізацыі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Заходняй Беларусі (1921–1937 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Горны Аляксандр Сяргеевіч ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мн., 2016. – 24 с.

29. Рабышка, В. Э. Этнапалітычныя працэсы ў Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гадах : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Рабышка Вольга Эдуардаўна ; БДПУ імя Максіма Танка. – Мн., 2004. – 22 с.

30. Трубчык, А. Г. Палітыка польскай улады ў сферы школьнай адукацыі на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1919–1921 гг. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Трубчык Алена Генадзьеўна ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мн., 2017. – 26 с.

31. Вайцешчык, Г. С. Мястэчкі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Вайцешчык Ганна Station-лаваўна ; БДПУ імя Максіма Танка. – Мн., 2013. – 23 с.

32. Радзюк, А. Л. Беларускія кааператывы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Радзюк Аляксей Леанідавіч ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мн., 2014. – 21 с.

33. Мярчук, В. М. Эміграцыя насельніцтва з Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Мярчук Вольга Мікалаеўна ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мн., 2015. – 23 с.

34. Лаўрэенка, Л. В. Прамысловасць, рамесніцтва і гандаль на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Лаўрэенка Ларыса Віктараўна ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мн., 2021. – 25 с.

35. Ганский, В. А. Развитие туризма в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Ганский Владимир Александрович ; Могилев. гос. ун-т им. А. А. Кулешова. – Могилев, 2020. – 24 с.

36. Ананька, К. Дз. Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Ананька Кірыл Дзмітрыевіч ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мн., 2025. – 31 с.

37. Цымбал, А. Г. Палітыка польскіх улад у адносінах да Праваслаўнай Царквы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Цымбал Аляксандр Георгіевіч ; БДПУ імя Максіма Танка. – Мн., 2009. – 24 с.

38. Цымбал, А. Г. Праваслаўная царква ў Заходняй Беларусі (1921–1939) / А. Г. Цымбал. – Мн. : МДЛУ, 2016. – 124 с.

39. Свирид, А. Н. Униатская церковь в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Свирид Александр Николаевич ; БГУ. – Мн., 2003. – 19 с.

40. Свирид, А. Н. Униатская церковь в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) / А. Н. Свирид. – Брест : Изд-во БрГУ, 2012. – 230 с.

41. Лисовская, Т. В. Неопротестантизм в Западной Беларуси в 1921–1939 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Лисовская Татьяна Витальевна ; Ин-т истории НАН Беларуси. – Мн., 2009. – 28 с.

42. Лисовская, Т. В. Поздний протестантизм в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) / Т. В. Лисовская. – Брест : Альтернатива, 2021. – 192 с.

43. Лисовская, Т. В. Поздний протестантизм в Беларуси (конец XIX в. – 1991 г.) / Т. В. Лисовская. – Мн. : Изд. центр БГУ, 2025. – 399 с.

44. Мазько, Э. А. Уплыў Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі на фармаванне культурнай сітуацыі ў Заходняй Беларусі ў 20–30-я гады XX ст. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 24.00.01 / Мазько Эдуард Аляксандравіч ; Гродзен. дзярж. ун-т імя Янкі Купалы. – Гродна, 2003. – 21 с.

45. Трацяк, І. І. Культурна-асветніцкая дзейнасць беларускіх каталіцкіх святароў (пачатак XX ст. – 1939 г.) : аўтарэф. дыс. … канд. культуралогіі : 24.00.02 / Трацяк Іван Іванавіч ; Гродзен. дзярж. ун-т імя Янкі Купалы. – Гродна, 2000. – 20 с.

46. Самосюк, Н. В. Деятельность Православной церкви как фактор развития культурной идентичности на территории Западной Беларуси (1921–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. культурологии : 24.00.01 / Самосюк Надежда Викторовна ; Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Мн., 2016. – 26 с.

47. Самосюк, Н. В. Деятельность Православной церкви как фактор развития культурной идентичности населения Западной Беларуси (1921–1939 гг.) / Н. В. Самосюк. – Брест : БрГУ, 2020. – 212 с.

48. Гецевич, А. К. Деятельность польских политических партий и организаций в Западной Беларуси (1918–1926 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Гецевич Андрей Казимирович ; БГУ. – Мн., 2007. – 21 с.

49. Черепица, В. Н. Очерки истории православной церкви на Гродненщине (с древнейших времён до наших дней) / В. Н. Черепица : в 2 ч. – Ч. 1. – Гродно : ГрГУ, 1999. – 320 с. ; Ч. 2.; Гродно : ГрГУ, 2005.– 440 с.

50. Швайко, В. Г. Деятельность русских организаций в Польше по сохранению русской культуры в 1921–1939 гг. : автореф. дис. …канд. ист. наук : 24.00.01 / Швайко Валентина Григорьевна ; Гродн. гос. ун-т им. Янки Купалы. – Гродно, 2005. – 22 с.

51. Иоффе, Э. Г. Страницы истории евреев Беларуси / Э. Г. Иоффе ; Еврейский ун-т в Минске. – Мн. : ПКФ «АРТИ-ФЕКС», 1996. – 292 с.

52. Мощук, А. В. Деятельность Бунда на территории Западной Беларуси в 1921–1939 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Мощук Анатолий Васильевич ; Ин-т истории НАН Беларуси. – Мн., 2008. – 22 с.

53. Стецкевич, П. Т. Деятельность еврейских политических партий и организаций на территории Западной Беларуси (1918–1926 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Стецкевич Петр Тадеушевич ; Ин-т истории НАН Беларуси. – Мн., 2008. – 25 с.

54. Щука, О. Л. Общественно-политическая деятельность еврейских партий и организаций в Западной Беларуси (1926–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Щука Ольга Леонидовна ; БГПУ им. Максима Танка. – Мн., 2015. – 26 с.

55. Соболевская, О. А. Евреи Гродненщины. Жизнь до Катастрофы / О. А. Соболевская, В. В. Гончаров. – Донецк : Норд-ПРЕСС, 2005. – 372 с.

56. Гужалоўскі, А. А. Станаўленне і развіццё музейнай справы Беларусі (1918–1941 гг.) : аўтарэф. дыс. … д-ра гіст. навук : 07.00.02 / Гужалоўскі Аляксандр Аляксандравіч ; БДУ. – Мн., 2002. – 34 с.

57. Цітовіч, І. У. Краязнаўчы рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Цітовіч Ігар Уладзіміравіч ; БДУ. – Мн., 2006. – 21 с.

58. Морозов, Д. В. Охрана памятников архитектуры в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 24.00.03 / Морозов Дмитрий Викторович ; БГУ. – Мн., 2019. – 22 с.

59. Міхайлец, М. А. Народная матэрыяльнай культура беларусаў у польскай этналогіі XIX – першай паловы XX стагоддзя: гістарыяграфія праблемы : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.07 / Міхайлец Міхаіл Анатольевіч ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі. – Мн., 2007. – 21 с.

60. Олюнина, И. В. Традиционная социальная культура Белорусского Полесья в работах польских этнологов 1920–1930-х гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.07 / Олюнина Ирина Владимировна ; Центр исслед. беларус. культуры, языка и лит. НАН Беларуси. – Мн., 2017. – 22 с.

REFERENCES

1. Savich, A. A. Gistoryya Zahodnyaj Belarusi (1921–1939 gg.) u ajchynnaj gistaryyagrafii 50–80-kh gg. XX st. / A. A. Savich // Vesci Nacyyanal'aj akademii navuk Belarusi. Seryya gumanitarnykh navuk. – 2020. – T. 65, № 1. – S. 44–51.

2. Gistoryya Belarusi : u 6 t. – Mn. : Ekaperspektyva, 2006. – T. 5 : Belarus' u 1917–1945 gg. / A. Vabishchevich [i insh.] ; redkal. : M. Kascyuk (gal. red.) [i insh.]. – 616 s.

3. Rizhskij mir v sud'be belorusskogo naroda. 1921–1953 gg. : v 2 kn. / NAN Belarusi, In-t istorii; redkol. : A. A. Kovalenya [i dr.]. – Mn. : Belarus. navuka, 2014. – Kn. 1. – 593 s.

4. Vabishchevich, A. M. Nacyyanal'na-kul'turnae zhyccyo Zahodnyaj Belarusi (1921–1939 gg.) / A. M. Vabishchevich. – Brest : Vyd-va BrDU, 2008. – 319 s.

5. Savich, A. A. Nacyyanal'na-vyzvalenchy rukh u Zakhodnyaj Belarusi (1921–1939 gg.): gistaryyagrafiya prablemy / A. A. Savich. – Brest : BrDU, 2012. – 288 s.

6. Savich, A. A. Aichynnaya gistaryyagrafiya gistoryi Zakhodnyaj Belarusi 1921–1939 gadou / A. A. Savich. – Brest : BrDU imya A. S. Pushkina, 2019. – 300 s.

7. Narysy gistoryi Belarusi : u 2 ch. / Akad. navuk Belarusi, In-t gistoryi ; redkal.: M. P. Kascyuk (gal. red.) [i insh.]. – Mn. : Belarus', 1994–1995. – Ch. 2. – 560 s.

8. Vabishchevich, A. M. Zakhodnyaya Belarus' / A. M. Vabishchevich // Kul'tura Belarusi : encykl. : u 6 t. – Mn. : Belarus. Encykl. imya Petrusya Brouki, 2010–2015. – T. 4. –2013. – S. 87–91.

9. Etnokul'turnye processy Zapadnogo Poles'ya (Brestchiny) v proshlom i nastoyashchem / A. V. Gurko [i dr.] ; nauch red. A. V. Gurko ; Nac. akad. navu Belarusi, Centr issled. belorus. kul'tury, yazyka i lit., In-t etnografii i fol'lora im. Kondrata Krapivy. – Mn. : Belarus. navuka, 2020. – 621 s.

10. Vabishchevich, A. M. Asveta u Zakhodnyai Belarusi (1921–1939 gg.) / A. M. Vabishchevich. – Brest : Vyd-va BrDU, 2004. – 116 s.

11. Vabishchevich, A. M. Nacyyanal'na-kul'turnae zhyccyo u Zakhodnyaj Belarusi (1921–1939 gg.) : autaref. dys. … d-ra gist. navuk : 07.00.02 / Vabishchevich Alyaksandr Mikalaevich ; BDU. – Mn., 2010. – 52 s.

12. Krivut', V. I. Molodezhnye organizacii na territorii Zapadnoj Belarusi (1929–1939 gg.) / V. I. Krivut' – Mn. : Belarus. navuka, 2008. – 164 s.

13. Kryvuts', V. I. Pad shyl'daj «dzyarzhaunaga vykhavannya»: realizacyya uradavykh vykhavauchykh kancepcyj na terytoryi Zakhodnyaj Belarusi (1926–1939) / V. I. Kryvuc'. – Baranavichy : RVA BarDU, 2010. – 196 s.

14. Kryvuc', V. I. Barac'ba za maladoe pakalenne Zakhodnyaj Belarusi i prauradavy maladzezhny rukh (1926–1939 gg.) / V. I. Kryvuc'. – Baranavichy : BarDU, 2013. – 273 s.

15. Krivut', V. I. Molodezhnye organizacii na territorii Zapadnoj Belarusi (1929–1939 gg.) : avtoref. dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / Krivut' Vitalij Ivanovich ; BGU. – Mn., 2005. – 21 s.

16. Krivut', V. I. Molodezhnaya politika pol'skikh vlastej v Zapadnoj Belarusi (1921–1939 gg.) : avtoref. dis. … d-ra ist. nauk : 07.00.02 / Krivut' Vitalij Ivanovich ; In-t istorii NAN Belarusi. – Mn., 2020. – 47 s.

17. Zagidulin, A. M. Nacyyanal'naya i kanfesiyanal'naya palityka pol'skikh ulad u adnosinah da belaruskaga nasel'nictva Zakhodnyaj Belarusi (1921–1939 gg.) : autaref. dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / Zagidulin Alyaksej Mikalaevich ; In-t gistoryi NAN Belarusi. – Mn., 2005. – 20 s.

18. Zagidulin, A. M. Belaruskae pytanne u pol'skaj natsyyanal'naj i kanfesijnaj palitycy u Zakhodnyaj Belarusi (1921–1939 gg.) / A. M. Zagidulin. – Grodna : GrDU, 2010. – 183 s.

19. Danilovich, V. V. Dzejnasts' arganizacyi «Zmaganne» u Zakhodnyaj Belarusi (1927–1930 gg.) : autaref. dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / Danilovich Vyachaslau Viktaravich ; BDPU imya Maksima Tanka. – Mn., 2000. – 21 s.

20. Danilovich, V. V. Dzejnasts' arganizacyi «Zmaganne» u Zakhodnyaj Belarusi (1927–1930 gg.) / V. V. Danilovich. – Mn. : Belarus. navuka, 2007. – 159 s.

21. Glina, V. M. Sutnasst' i asablivasst'i nacyyanal'naga adradzhennya u Zakhodnyaj Belarusi (1920–1939 gg.) : autaref. dys. … kand. filas. navuk : 09.00.03 / Glina Valyancin Mikalaevich ; BDU. – Mn., 1996. – 19 s.

22. Pashkevich, A. V. Parlamenckiya formy zmagannya za nacyyanal'nyya i satsyyal'nyya pravy belaruskaga naroda u mizhvaennaj Pol'shchy (1921–1930 gg.) : autaref. dys. ... kand. gist. navuk : 07.00.02 / Pashkevich Alyaksandr Vasil'evich ; BDPU imya Maksima Tanka. – Mn., 2006. – 21 s.

23. Pashkovich, A. I. Dzejnasc' dabrachynnykh arganizacyj na terytoryi Zakhodnyaj Belarusi u 1921–1939 gg. : autaref. … dys. kand. gist. navuk : 07.00.02 / Pashkovich Alena Iosifauna ; In-t gistoryi NAN Belarusi. – Mn., 2007. – 22 s.

24. Borka, A. I. Myastsovyyya organy dzyarzhaunaga kiravannya i samakiravannya u Zakhodnyaj Belarusi (1921–1939 gg.) : autaref. dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / Borka Andrej Ivanavich ; In-t gistoryi NAN Belarusi. – Grodna, 2007. – 19 s.

25. Borka, A. I. Myastsovyya organy dzyarzhaunaga kiravannya i samakiravannya u Zakhodnyaj Belarusi (1921–1939 gg.) / A. I. Borka. – Grodna : GrDU, 2011. – 139 s.

26. Darkovich, A. L. Gorodskoe samoupravlenie na zapadnobelorusskikh zemlyakh mezhvoennoj Pol'shi (1919–1939 gg.) : avtoref. dis. … kand. ist. nauk : 07.00.03 / Darkovich Aleksandr Leonidovich ; In-t slavyanovedeniya RAN. – M., 2016. – 30 s.

27. Razuvanava, K. S. Dzejnasts' Belaruskaga instytuta gaspadarki i kul'tury u Zakhodnyaj Belarusi (1926–1936 gg.) : autaref. dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / Razuvanava Kseniya Syargeeўua ; In-t gistoryi NAN Belarusi. – Mn., 2011. – 24 s.

28. Gorny, A. S. Belaruskiya palanafil'skiya arganizacyi u gramadska-palitychnym i kul'turnym zhycci Zakhodnyaj Belarusi (1921–1937 gg.) : autaref. dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / Gorny Alyaksandr Syargeevich ; In-t gistoryi NAN Belarusi. – Mn., 2016. – 24 s.

29. Rabyshka, V. E. Etnapalitychnyya pratsesy u Zakhodnyaj Belarusi u 1919–1939 gadakh : autaref. dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / Rabyshka Vol'ga Eduardauna ; BDPU imya Maksima Tanka. – Mn., 2004. – 22 s.

30. Trubchyk, A. G. Palityka pol'skaj ulady u sfery shkol'naj adukacyi na akupavanaj terytoryi Belarusi u 1919–1921 gg. : autaref. dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / Trubchyk Alena Genadz'euna ; In-t gistoryi NAN Belarusi. – Mn., 2017. – 26 s.

31. Vajceshchyk, G. S. Myastechki Zakhodnyaj Belarusi (1921–1939 gg.): sacyyal'na-ekanamichnae i kul'turnae razviccyo : autaref. dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / Vajceshchyk Ganna Stanislavauna ; BDPU imya Maksima Tanka. – Mn., 2013. – 23 s.

32. Radzyuk, A. L. Belaruskiya kaaperatyvy u Zakhodnyaj Belarusi (1921–1939 gg.) : autaref. dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / Radzyuk Alyaksej Leanidavich ; In-t gistoryi NAN Belarusi. – Mn., 2014. – 21 s.

33. Myarchuk, V. M. Emigracyya nasel'nictva z Zakhodnyaj Belarusi (1921–1939 gg.) : autaref. dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / Myarchuk Vol'ga Mikalaeuna ; In-t gistoryi NAN Belarusi. – Mn., 2015. – 23 s.

34. Laureyenka, L. V. Pramyslovasc', ramesnictva i gandal' na terytoryi Zakhodnyaj Belarusi (1921–1939 gg.) : autaref. dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / Laureyenka Larysa Viktarauna ; In-t gistoryi NAN Belarusi. – Mn., 2021. – 25 s.

35. Ganskij, V. A. Razvitie turizma v Zapadnoj Belarusi (1921–1939 gg.) : avtoref. dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / Ganskij Vladimir Aleksandrovich ; Mogilev. gos. un-t im. A. A. Kuleshova. – Mogilev, 2020. – 24 s.

36. Anan'ka, K. Dz. Belaruskiya gimnazii u Zakhodnyaj Belarusi (1921–1939 gg.) : autaref. dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / Anan'ka Kiryl Dzmitryevich ; In-t gistoryi NAN Belarusi. – Mn., 2025. – 31 s.

37. Tsymbal, A. G. Palityka pol'skikh ulad u adnosinakh da Pravaslaunaj Carkvy u Zakhodnyaj Belarusi (1921–1939 gg.) : autaref. dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / Tsymbal Alyaksandr Georgievich ; BDPU imya Maksima Tanka. – Mn., 2009. – 24 s.

38. Tsymbal, A. G. Pravaslaunaya carkva u Zakhodnyaj Belarusi (1921–1939) / A. G. Tsymbal. – Mn. : MDLU, 2016. – 124 s.

39. Svirid, A. N. Uniatskaya cerkov' v Zapadnoj Belarusi (1921–1939 gg.) : avtoref. dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / Svirid Aleksandr Nikolaevich ; BGU. – Mn., 2003. – 19 s.

40. Svirid, A. N. Uniatskaya cerkov' v Zapadnoj Belarusi (1921–1939 gg.) / A. N. Svirid. – Brest : Izd-vo BrGU, 2012. – 230 c.

41. Lisovskaya, T. V. Neoprotestantizm v Zapadnoj Belarusi v 1921–1939 gg. : avtoref. dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / Lisovskaya Tat'yana Vital'evna ; In-t istorii NAN Belarusi. – Mn., 2009. – 28 s.

42. Lisovskaya, T. V. Pozdnij protestantizm v Zapadnoj Belarusi (1921–1939 gg.) / T. V. Lisovskaya. – Brest : Al'ternativa, 2021. – 192 s.

43. Lisovskaya, T. V. Pozdnij protestantizm v Belarusi (konets XIX v. – 1991 g.) / T. V. Lisovskaya. – Mn. : Izd. tsentr BGU, 2025. – 399 s.

44. Maz'ko, E. A. Uplyu Belaruskaj Khrysciyanskaj Demakratyi na farmavanne kul'turnaj situacyi u Zakhodnyaj Belarusi u 20–30-ya gady XX st. : autaref. dys. … kand. gist. navuk : 24.00.01 / Maz'ko Eduard Alyaksandravich ; Grodzen. dzyarzh. un-t imya Yanki Kupaly. – Grodna, 2003. – 21 s.

45. Tracyak, I. I. Kul'turna-asvetnickaya dzejnasts' belaruskikh katalickikh svyatarou (pachatak XX st. – 1939 g.) : autaref. dys. … kand. kul'turalogii : 24.00.02 / Tracyak Ivan Ivanavich ; Grodzen. dzyarzh. un-t imya Yanki Kupaly. – Grodna, 2000. – 20 s.

46. Samosyuk, N. V. Deyatel'nost' Pravoslavnoj cerkvi kak faktor razvitiya kul'turnoj identichnosti na territorii Zapadnoj Belarusi (1921–1939 gg.) : avtoref. dis. … kand. kul'turologii : 24.00.01 / Samosyuk Nadezhda Viktorovna ; Belorus. gos. un-t kul'tury i iskusstv. – Mn., 2016. – 26 s.

47. Samosyuk, N. V. Deyatel'nost' Pravoslavnoj cerkvi kak faktor razvitiya kul'turnoj identichnosti naseleniya Zapadnoj Belarusi (1921–1939 gg.) / N. V. Samosyuk. – Brest : BrGU, 2020. – 212 s.

48. Gecevich, A. K. Deyatel'nost' pol'skikh politicheskikh partij i organizacij v Zapadnoj Belarusi (1918–1926 gg.) : avtoref. dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / Gecevich Andrej Kazimirovich ; BGU. – Mn., 2007. – 21 s.

49. Cherepica, V. N. Ocherki istorii pravoslavnoj cerkvi na Grodnenshchine (s drevnejshikh vremyon do nashikh dnej) / V. N. Cherepica : v 2 ch. – Ch. 1. – Grodno : GrGU, 1999. – 320 s. ; Ch. 2.; Grodno : GrGU, 2005.– 440 s.

50. Shvayko, V. G. Deyatel'nost' russkikh organizacij v Pol'she po sokhraneniyu russkoj kul'tury v 1921–1939 gg. : avtoref. dis. … kand. ist. nauk : 24.00.01 / Shvajko Valentina Grigor'evna ; Grodn. gos. un-t im. Yanki Kupaly. – Grodno, 2005. – 22 s.

51. Ioffe, E. G. Stranicy istorii evreev Belarusi / E. G. Ioffe ; Evrejskij un-t v Minske. – Mn. : PKF «ARTI-FEKS», 1996. – 292 s.

52. Moshchuk, A. V. Deyatel'nost' Bunda na territorii Zapadnoj Belarusi v 1921–1939 gg. : avtoref. dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / Moshchuk Anatolij Vasil'evich ; In-t istorii NAN Belarusi. – Mn., 2008. – 22 s.

53. Steckevich, P. T. Deyatel'nost' evrejskikh politicheskikh partij i organizacij na territorii Zapadnoj Belarusi (1918–1926 gg.) : avtoref. dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / Steckevich Petr Tadeushevich ; In-t istorii NAN Belarusi. – Mn., 2008. – 25 s.

54. Shchuka, O. L. Obshchestvenno-politicheskaya deyatel'nost' evrejskikh partij i organizacij v Zapadnoj Belarusi (1926–1939 gg.) : avtoref. dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / Shchuka Ol'ga Leonidovna ; BGPU im. Maksima Tanka. – Mn., 2015. – 26 s.

55. Sobolevskaya, O. A. Evrei Grodnenshchiny. Zhizn' do Katastrofy / O. A. Sobolevskaya, V. V. Goncharov. – Doneck : Nord-PRESS, 2005. – 372 s.

56. Guzhalouski, A. A. Stanaulenne i razviccyo muzejnaj spravy Belarusi (1918–1941 gg.) : autaref. dys. … d-ra gist. navuk : 07.00.02 / Guzhalouski Alyaksandr Alyaksandravich ; BDU. – Mn., 2002. – 34 s.

57. Citovich, I. U. Krayaznauchy rukh na terytoryi Zakhodnyaj Belarusi (1921–1939 gg.) : autaref. dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / Citovich Igar Uladzimiravich ; BDU. – Mn., 2006. – 21 s.

58. Morozov, D. V. Okhrana pamyatnikov arkhitektury v Zapadnoj Belarusi (1921–1939 gg.) : avtoref. dis. … kand. ist. nauk : 24.00.03 / Morozov Dmitrij Viktorovich ; BGU. – Mn., 2019. – 22 s.

59. Mikhajlets, M. A. Narodnaya materyyal'naj kul'tura belarusau u pol'skaj etnalogii XX – pershaj palovy XXI stagoddzya: gistaryyagrafiya prablemy : autaref. dys. … kand. gist. navuk : 07.00.07 / Mihajlets Mikhail Anatol'evich ; In-t mastactvaznaustva, etnagrafii i fal'kloru imya Kandrata Krapivy NAN Belarusi. – Mn., 2007. – 21 s.

60. Olyunina, I. V. Tradicionnaya social'naya kul'tura Belorusskogo Poles'ya v rabotakh pol'skikh etnologov 1920–1930-kh gg. : avtoref. dis. … kand. ist. nauk : 07.00.07 / Olyunina Irina Vladimirovna ; Centr issled. belarus. kul'tury, yazyka i lit. NAN Belarusi. – Mn., 2017. – 22 s.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 08.04.2026*